# ТВОРЧЫЯ СУСТРЭЧЫ

## Пятро Прыходзька і група беларускіх паэтаў на Хоцімшчыне.

Днямі на Хоцімшчыне адбыліся дні беларускай паэзіі, прысвечаныя 70-годдзю паэта-земляка, лаўрэата літаратурнай прэміі імя А. Куляшова Пятра Фёдаравіча Прыходзькі. З ім у раён прыехалі беларускія паэты: Павел Пруднікаў, Генадзь Дзмітрыеў і Алесь Пісьмянкоў.

Першая сустрэча адбылася ў рэдакцыі райгазеты «Шлях Кастрычніка», дзе за шклянкаю чаю вялася гаворка аб сучаснай беларускай паэзіі.

Старшыня раённага літаратурнага аб'яднання «Зоркі над Бесяддзю» Мікалай Паўлавіч Саўчанка прачытаў вершы П. Прыходзькі аб дружбе беларускага і рускага народаў, а таксама ўспомніў радкі са сваіх вершаў на гэту тэму.

Ураджэнец Касцюковіцкага раёна Алесь Пісьмянкоў, які працуе ў часопісе «Полымя», заклікаў мясцовых журналістаў дасылаць заметкі, артыкулы на тэмы экалогііі, аховы помнікаў, старыны.

Генадзь Дзмітрыеў пазнаёміў работнікаў і актыў рэдакцыі райгазеты з дзейнасцю Саюза пісьменнікаў БССР.

Паэт старэйшага пакалення Павел Іванавіч Пруднікаў, ураджэнец Клімавіцкага раёна, па- партарганізацыі М. А. Шайкоў прадставіў літаратараў. П. Пруднікаў, Г. Дзмітрыеў, А. Пісьмянкоў і П. Прыходзька прачыталі свае вершы, расказалі аб творчым жыцці ў сталіцы Беларусі — Мінску, адказалі на пытанні.

На наступны дзень пісьменнікі наведалі сярэднюю школу №1, дзе сабраліся педагогі, работнікі бібліятэк, другія аматары літаратуры. Работніца цэнтральнай раённай бібліятэкі Марыя Ануфрыеўна Мамліенка расказала біяграфію юбіляра — П. Ф. Прыходзькі. Яна не карысталася сухімі лічбамі, а яскрава, з цеплынёй гаварыла аб дзяцінстве, юнацкіх гадах паэта.

Бібліятэкары Надзея Яшчанка і Валянціна Антоненка прачыталі вершы П. Прыходзькі аб родным краі, аб Хоцімску, аб вайне.

Потым літаратары П. Пруднікаў, А. Пісьмянкоў, Г. Дзмітрыеў і П. Прыходзька прачыталі свае новыя вершы, падзяліліся сваімі думкамі наконт беларускай культуры, адказалі на пытанні.

Член бюро райкома КПБ, член прэзідыума раённага Савета народных дэпутатаў, рэдакта райгазеты «Шлях Кастрыч-

дзяліўся ўспамінамі аб сустрэчах з беларускімі пісьменнікамі Янкам Купалам, Якубам Коласам, Міхасём Чаротам, Міхасём Зарэцкім і іншымі. Ён расказаў таксама, як быў рэпрэсіраваны ў гады сталіншчыны.

Пятро Прыходзька часта бывае ў рэдакцыі райгазеты, таму ён шчыра падзякаваў арганізатараў сустрэчы, аставіў некалькі новых вершаў для публікацыі. Потым ўся літаратурная брыгада адправілася ў калгас «Перамога».

Тут, у новым клубе беларускіх паэтаў чакалі хлебаробы гаспадаркі, іх дзеці. Сакратар ніка» Д. Я. Лапцеўскі ўручыў Пятру Фёдаравічу Прыходзьку прывітальны адрас райкома партыі і раённага Савета, а таксама памятны падарунак. Гэта ў гонар 70-годдзя з дня нараджэння паэта-земляка.

Са шчырымі словамі падзякі выступіў П. Прыходзька.

У заключэнне многія ўдзельнікі сустрэчы змаглі набыць кнігі П. Прыходзькі і П. Прудні-кава, на якіх паэты аставілі свае аўтографы.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці РДК праспявалі як гасцям, так і ўсім прысутным некалькі беларускіх песен.

**Д. ЯГОРАЎ.**

**Ягораў, Д. Творчыя сустрэчы** : [Пятро Прыходзька і група беларускіх паэтаў на Хоцімшчыне] / Д. Ягораў // Шлях Кастрычніка. — 1990. — 3 красавіка. — С. 1.